**З НОВЫМ НАВУЧАЛЬНЫМ ГОДАМ!**




# Гродзенскі Універсітэт

ГАЗЕТА ГРОДЗЕНСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ

Выдаецца з 1986 года • № 6 (257) • *1 верасня 1998 года, аўторак*

Выходзіць адзін раз у месяц • Распаўсюджваецца бясплатна


***Фотарэпартаж***

## ПЛЕМЯ МАЛАДОЕ, НЕЗНАЁМАЕ

Сёлетні прыём абітурыентаў на першы погляд нічым не адрозніваецца ад мінулагодніх. Такія ж юнакі і дзяўчаты, выпускнікі сярэдніх школ, як і летась, як і пяць, дзесяць гадоў таму. Але гэта толькі на першы погляд. На самой справе маладое папаўненне - гэта нешта зусім новае, з адбіткам усіх рэформ і перамен нашага жыцця і грамадства. Давайце паслухаем, што думаюць наконт сваёй будучыні самі абітурыенты.



- Маё імя - Алёна. Нават не чакала, што будзе такі конкурс. Хачу стаць настаўніцай гісторыі. Пасля першага экзамену нейкая няўпэўненасць з'явілася, хаця я атрымала 4,5 балы. Вельмі шмат двоек, нават у тых, хто ўпэўнены ў сваіх ведах па прадмету. Але нічога не зробіш: конкурс ёсць конкурс.

- А мне абыякава, паступлю я, ці не. Бацькі вельмі хочуць, каб хаця на «здавальняюча» здаў. Тады можна

*Працяг на 2-й стар.*

## ПЕРШАКУРСНІК - 98

Падведзены вынікі работы прыёмнай камісіі. Як паведаміла рэдакцыі газеты метадыст прыёмнай камісіі Лілія Іванаўна Баброўнік, сёлета праведзена вялікая работа па прыёму. Сур"ёзным быў конкурс амаль на ўсе спецыяльнасці, вытрымалі яго самыя падрыхтаваныя.

Так, план прыёму толькі на дзённую бюджэтную форму навучання складаў 875, а пададзена заяў было 1625. Усяго ж вытрымалі ўступныя экзамены 821 абітурыент, сумоўе - 95. 75 медалістаў з мэтавым накіраваннем, а таксама 20 чалавек па рэкамендацыі ў межах 20 працэнтаў трымалі конкурс.

Такім чынам залічаны 885 чалавек, у тым ліку - 55 - без іспытаў, пасля АДП - 222 чалавекі. Варта дадаць, што 82 першакурснікі маюць ужо стаж практычнай работы ці прафесійную адукацыю, у тым ліку таксама звольненыя ў запас вайскоўцы. Па абранай спецыяльнасці маюць прафесійную адукацыю 57 чалавек.

На дзённую платную форму навучання па спецыяльнасці "Англійская мова і сучасныя замежныя мовы" пры плане прыёму 45 было пададзена 48 заяў. Залічаны 46 чалавек, у тым ліку 17 - пасля АДП.

На завочную бюджэтную форму навучання па спецыяльнасці "Біялогія" пры плане 20 пададзена 40 заяў. Уступныя экзамены вытрымаў 21, залічаны 20 чалавек. На завочную платную форму па гэтай спецыяльнасці пры плане 10 пададзена было 20 заяў. Па выніках уступных экзаменаў і сумоўя залічаны 20 чалавек.

На вячэрнюю бюджэтную і платную формы навучання быў прыём па спецыяльнасці "Радыёфізіка". Залічаны адпаведна 18 і 1 чалавек.

Больш падрабязны аналіз прыёму - 98 будзе апублікаваны ў наступным нумары газеты.

### ВІНШАВАЛЬНАЯ ПАШТОЎКА

***НАГАДВАЕМ, КАЛІ І КАГО МОЖНА ПАВІНШАВАЦЬ З ЮБІЛЕЕМ.***

* 1 верасня - **Марыю Пятроўну АЛЕКСАНДРУК** - дзяжурную інтэрната N 2.
* 5 верасня - **Ядвігу Пятроўну САЛОВІЧ** - кладаўшчыка факультэта фізічнай культуры.
* 6 верасня - **Уладзіславу Уладзіміраўну ІВАНОВУ** - метадыста аддзела па выхаваўчай рабоце.
* 15 верасня - **Антаніну Іванаўну КАРПОВІЧ** - метадыста 1 катэгорыі навучальнага аддзела.
* 20 верасня - **Рыгора Фядосавіча КУРЫШКУ** - дацэнта кафедры нямецкай мовы.
* 22 верасня - **Таісію Сцяпанаўну ЧМЕЛЬ** - бухгалтара 1 катэгорыі.
* 25 верасня - **Алену Афанасьеўну КАРАЛЁВУ** - акампаніятара кафедры харавога дырыжыравання і вакалу.

### ЦИТАТА НОМЕРА:

***"Знание и только знание делает человека свободным и великим".***

***Д. Писарев.***

# ПЛЕМЯ МАЛАДОЕ, НЕЗНАЁМАЕ







будзе паспрабаваць паступіць на платнай аснове. Бо вельмі ж не хочацца ў войска ісці...

- А я ўпэўнены, што стану студэнтам. У школе быў выдатнікам, маю сярэбраны медаль. Дастаткова прайсці сумоўе. Мінімум - 23 балы. Я іх вазьму...

Такія вось яны, сёлетнія абітурыенты. Сёння ўжо можна павіншаваць многіх з іх, у тым ліку і Алёну, і сярэбранага медаліста - яны залічаны на першы курс. А тым, хто не паступіў, застаецца толькі паспачуваць і выказаць пажаданне: у наступны раз не спадзявайцеся на нейкі цуд, на шпаргалку. Бо выкладчыкаў, членаў камісіі вельмі цяжка падмануць. А дакладней - проста немагчыма "праскочыць". Патрэбны сур'ёзныя веды, добрая падрыхтоўка.

І ўсё ж цудоўная гэта пара - уступныя экзамены. Цішыня ва універсітэцкіх калідорах, напружаныя твары бацькоў, якія застылі ў чаканні ў вестыбюлі, бо ходу ў час экзаменаў ва універсітэт няма. Ля кожных дзвярэй дзяжураць студэнты старэйшых курсаў: на час экзаменаў дзейнічае прапускная сістэма. А там, у аўдыторыях, ідзе сур'ёзная, засяроджаная работа. Напружана працуюць тыя, што здаюць экзамен; важна нічога не прапусціць, не забыцца, каб адказ на пытанне быў поўным, каб не памыліцца. Яшчэ больш адказная работа ў тых, хто прымае экзамены.

Сёння ўжо ўсе трывогі ў мінулым. Наперадзе - новае жыццё, студэнцкае, поўнае нечаканага, нязведанага. У добры ж шлях! Няхай ён будзе сапраўды добрым!

**Л. ДАНІЛАВА.**

**НА ЗДЫМКАХ: ідуць экзамены.**

**Фота Ул. САРОКІНА.**



## ЯКІЯ МЫ?

Аналіз сацыяльна-дэмаграфічнага складу першакурснікаў, якія паступілі на дзённую бюджэтную форму навучання, паказвае, што найбольшая колькасць заяў - 902 - пададзена ад служачых ці дзяцей служачых, 602 - ад рабочых, 191 - калгаснікаў. Залічаны (у працэнтах да агульнай колькасці) адпаведна 55,4, 29,4, 5,6.

З сельскай мясцовасці залічаны 213, жыхароў Гродзенскай вобласці - 839, у тым ліку жыхароў Гродна - 447 чалавек.

З агульнай колькасці залічаных 558 жанчын і 327 мужчын.

Па нацыянальным складзе статыстыка такая: 637 - беларусы, 93 - рускія, 150 - палякі, 5 чалавек - іншых нацыянальнасцей.

# САВЕТ УНІВЕРСІТЭТА: ГРАНІ ДЗЕЙНАСЦІ

**ПА МАТЭРЫЯЛАХ СПРАВАЗДАЧНАГА ДАКЛАДА РЭКТАРА УНІВЕРСІТЭТА С.А. МАСКЕВІЧА НА ПАСЯДЖЭННІ САВЕТА УНІВЕРСІТЭТА АД 26 ЧЭРВЕНЯ 1998 ГОДА**

## Задачы Савета

Галоўная задача Савета універсітэта - аб'яднанне намаганняў калектыву універсітэта для падрыхтоўкі кваліфікаваных спецыялістаў.

З мэтай вырашэння галоўнай задачы і выканання плана развіцця Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Янкі Купалы на 1996-2001 гады ў бягучым навучальным годзе на Савеце абмяркоўвалася 14 пытанняў і праблем. Вось толькі некаторыя з іх - аб выніках уступных экзаменаў 1997 года; аб выніках дзяржаўных экзаменаў 1997 года; аб выніках экзаменацыйных сесій на стацыянары і АЗН і перспектывах удасканалення арганізацыі і правядзення курсавых экзаменаў і залікаў; аб выніках навукова-даследчай дзейнасці універсітэта за 1997 г.; аб рабоце кафедр па ўкараненні вынікаў НДР у вытворчасць і навучальны працэс і перспектывах развіцця прыкладных навуковых даследаванняў; аб стане і асноўных напрамках развіцця НДРС і аб развіцці магістратуры і аспірантуры; аб стане выхаваўчай работы ва універсітэце і мерах па яе ўдасканаленні, аб перспектывах развіцця ГрДУ імя Янкі Купалы і іншыя пытанні. Усе пытанні плана работы Савета былі абмеркаваны на пасяджэннях Савета, якія праводзіліся кожны месяц. На пасяджэннях Савета ў 1997/98 навучальным годзе ў адпаведнасці з аб'яўленым конкурсам былі прыняты рашэнні па замяшчэнні 11 пасад загадчыкаў кафедр і 3 пасад прафесара.

Важную ролю ў аналізе адпаведнасці кандыдатур удзельнікаў конкурса патрабаванням палажэння адыгрывае конкурсная камісія Савета універсітэта. Усяго на працягу года камісіяй разгледжаны кандыдатуры па 96 вакансіях, у тым ліку 11 загадчыкаў кафедр, 36 дацэнтаў, 28 старшых выкладчыкаў, 15 выкладчыкаў, 3 асістэнтаў.

## Навучальная работа

Уся работа калектыву універсітэта падпарадкавана асноўнай задачы - забеспячэнню якаснай падрыхтоўкі спецыялістаў для Рэспублікі Беларусь ва ўмовах рэфармавання нацыянальнай сістэмы вышэйшай адукацыі і рэалізацыі канцэпцыі «Універсітэт - рэгіянальны цэнтр адукацыі, навукі і культуры». У рамках выканання гэтай задачы і працаваў калектыў у 1997-98 годзе.

Рэалізацыя асноўнай мэты прадугледжвала працяг раней пачатай работы па ўдасканаленні структуры спецыяльнасцей і спецыялізацый, па якіх вядзецца падрыхтоўка ва універсітэце. Так, факультэтамі і кафедрамі праведзена неабходная падрыхтоўчая работа для адкрыцця з мінулага навучальнага года такіх спецыяльнасцей, як «Эканоміка і кіраванне на прадпрыемстве» (факультэт эканомікі і кіравання), «Прыкладная матэматыка» (матэматычны факультэт), «Педагогіка і псіхалогія дашкольная» (завочная форма навучання, факультэт псіхалогіі і педагогікі).

Заслугоўваюць увагі і такія новыя спецыялізацыі, падрыхтоўка па якіх пачнецца з набору 1998/99 года. Гэта - «Камп'ютэрная лінгвістыка» на спецыяльнасці «Беларуская мова і літаратура», «Экалагічная таксікалогія, біяіндыкацыя і нармаванне» на спецыяльнасці «Экалогія».

Нялёгка працягваўся пераход на новае пакаленне тыповых планаў, што абумоўлена вельмі часта недасканаласцю апошніх і нават памылкамі ў іх. Аднак факультэты і кафедры не ў поўную меру выкарысталі свае правы на распрацоўку і зацвярджэнне ў Міністэрстве адукацыі індывідуальных навучальных планаў, а матэматычны факультэт нават пры адсутнасці тыповага плану па спецыяльнасці «Матэматыка» і дамоўленасці ў Міністэрстве аб зацвярджэнні існуючага плана, не зрабіў адпаведных заказаў.

Усе падрыхтаваныя факультэтамі праекты індывідуальных планаў, а гэта планы па спецыяльнасцях Г05.01. 00 «Гісторыя», Г07.01.00 «Псіхалогія», Н06.01.00 «Экалогія», паспяхова прайшлі рэцэнзаванне і зацверджаны Міністэрствам адукацыі ў якасці індывідуальных. Гэтыя планы дазволяць, пачынаючы ўжо з 1998/99 навучальнага года, рэалізоўваць арыгінальныя змястоўныя падыходы да гуманітарнай падрыхтоўкі студэнтаў, а таксама ўлічваць рэгіянальныя асаблівасці падрыхтоўкі спецыялістаў.

Шмат праблем узнікла, і, на жаль, на сённяшні дзень яны не зняты, пры падрыхтоўцы на базе тыповых навучальных планаў рабочых варыянтаў. Гэта і адтэрміноўкі ў падрыхтоўцы факультэтамі праектаў рабочых планаў да экспертызы, і недахопы самой экспертызы, якая часам праводзілася даволі паваярхоўна. Як вынік - недапрацаваны рабочы навучальны план спецыяльнасці П02.01.00.

Яшчэ адзін істотны недахоп у рабочых навучальных планах - імкненне максімальна павялічыць аўдыторныя гадзіны. Як вынік - адсутнасць часу, прызначанага на самастойную работу студэнтаў. Гэта вядзе да перагружанасці студэнтаў і выкладчыкаў, цяжкасцей у засваенні імі неабходнага вучэбнага матэрыялу, неэфектыўнага выкарыстання аўдыторнага фонду, зніжэння ўзроўню ведаў.

Для выпраўлення становішча былі выдадзены шэраг загадаў, прынята пастанова Савета універсітэта. Аднак толькі адміністратыўныя захады не даюць эфекту. Патрэбны зрухі ў свядомасці кожнага: пераарыентацыя не на словах, а на справе на гуманізацыю адукацыі, якая заснавана на прыярытэтнасці, цэнтральнай ролі асобы студэнта ў навучальным працэсе і арыентавана на выпрацоўку ў будучых спецыялістаў актыўнай грамадзянскай пазіцыі.

У сувязі з гэтым пачалося ўпарадкаванне відаў, форм і аб'ёмаў навучальных даручэнняў кафедр. Вядзецца работа па замацаванні штатаў кафедр і факультэтаў з улікам колькасці студэнтаў і неабходнасці забяспечыць выкананне новага пакалення тыповых навучальных планаў; прынятае на 1998/99 г. палажэнне аб унармаванні навучальнай працы выкладчыкаў дае шырокія магчымасці факультэтам і кафедрам у вызначэнні памераў факультэцкай, кафедральнай і індывідуальнай нагрузкі ў залежнасці ад існуючых штатаў і аб'ёму навучальных даручэнняў.

Важным паказчыкам дзейнасці універсітэта па падрыхтоўцы спецыялістаў з'яўляецца працаўладкаван-

*Працяг на 4-й стар.*

# САВЕТ УНІВЕРСІТЭТА: ГРАНІ ДЗЕЙНАСЦІ

*Пачатак на 3-й стар.*

не выпускнікоў. У мінулым навучальным годзе выпуск склаў 1593 чалавекі. Размеркаванню належалі 948 чалавек, або 60 працэнтаў. Права самастойнага працаўладкавання атрымалі 332 чалавекі, або 21 працэнт.

На жаль, у мінулым навучальным годзе за акадэмічную непасяховасць адлічаны 167 студэнтаў.

Мы адчуваем цяжкасці і ў матэрыяльным забеспячэнні навучальнага працэсу. Робіцца ўсё, што ў нашых сілах; ёсць 10 камп'ютэрных класаў, пашыраецца доступ у INTERNET, ёсць на кожным факультэце ксеракс, на кожнай кафедры - камп'ютэр. Дастунпасць сучасных тэхнічных сродкаў ставіць новыя задачы - па эфектыўнасці іх выкарыстання, застаецца надзённай і праблема эфектыўнага выкарыстання аўдыторнага фонду.

Эфектыўнасць навучальнай работы непасрэдна залежыць ад дзейснасці сістэмы навучальна-метадычнага і арганізацыйна-метадычнага забеспячэння навучальна-выхаваўчага працэсу. Розныя аспекты гэтай сістэмы разглядаліся на пасяджэннях Савета. Вызначаны прыярытэтныя напрамкі навучальна-метадычнай работы.

Як станоўчы факт у арганізацыі метадычнай работы ва універсітэце можна адзначыць актывізацыю работы створаных у пачатку навучальнага года метадычных камісій па спецыяльнасцях. Іх 15, аб'ядноўваюць яны інтэлект і вопыт найбольш кваліфікаваных выкладчыкаў для ўдасканалення методык навучання і павышэння якасці адукацыі.

Ажыццяўляецца пераход да перспектыўнага планавання падрыхтоўкі і выдання навучальна-метадычных матэрыялаў на падставе камп'ютэрных карт сістэмна-метадычнага забеспячэння навучальнага працэсу. Стварэнне гэтых карт і іх аналіз дазваляюць беспамылкова вызначаць тыя спецыяльнасці, спецыялізацыі і дысцыпліны, для метадычнага забеспячэння якіх неабходны набыццё ці распрацоўка адпаведных дапаможнікаў. Ажыццяўляецца пераход ад падрыхтоўкі навучальных праграм і навучальных дапаможнікаў для універсітэцкіх патрэб да ўзроўню навукова-метадычнай прадукцыі рэспубліканскага ўзроўню. Для зацвярджэння ў якасці тыповых накіраваны ў НМЦ «Вышэйшая школа» 5 навучальных праграм. Выдадзены на беларускай мове грунтоўны падручнік па гісторыі філасофіі для вну пад рэдакцыяй Ч.С. Кірвеля. У выдавецтве Маскоўскага дзяржаўнага універсітэта выдадзены падручнік Г.Р. Шыханцова «Юридическая психология», 4551 экзэмпляр навучальна-метадычнай літаратуры перададзены ў бібліятэку універсітэта выдавецкім аддзелам толькі за 1997 год.

Аднак у арганізацыі навучальна-метадычнай работы па-ранейшаму шмат праблем. Гэта і распрацоўка крытэрыяў якасці навучальна-метадычнай работы, і яе нармаванне, і пошук эфектыўных шляхоў спалучэння навучальнай і выхаваўчай работы і многае іншае.

## Выхаваўчая, фізкультурная і культурна-масавая работа

У мінулым навучальным годзе аддзелам выхаваўчай работы ажыццяўлялася работа па ўдасканаленні сістэмы арганізацыі работы са студэнтамі, якая накіравана на вырашэнне асноўных задач - стварэнне ўмоў для творчай самарэалізацыі кожнага студэнта універсітэта ў навучальнай, навучальна-даследніцкай, навукова-даследніцкай, грамадскай дзейнасці, у асабістым побыце і адпачынку; кіраванне працэсам самарэалізацыі студэнтаў, які дае магчымасць атрымліваць высокаадукаваных і прафесійна падрыхтаваных спецыялістаў, свядомых грамадзян, патрыётаў сваёй айчыны, людзей, здольных вырашаць складаныя жыццёвыя праблемы.

Распрацавана нарматыўная дакументацыя, якая вызначае ўнутраны распарадак у навучальных корпусах і інтэрнатах універсітэта, а таксама функцыянальныя абавязкі і змест дзейнасці намесніка дэкана факультэта па выхаваўчай рабоце, куратара студэнцкай групы, выхавальніка інтэрната, органаў студэнцкага самакіравання ў інтэрнатах.

Грунтоўна і надзейна ў мінулым навучальным годзе працавалі факультэт грамадскіх прафесій, спартыўны клуб універсітэта, прафсаюзны камітэт студэнтаў, забяспечвалі цікавыя заняткі студэнтаў на сваіх аддзяленнях і секцыях, правядзенне культурна-масавых, фізкультурна-масавых і спартыўных мерапрыемстваў на факультэтах і ва універсітэце. Творчыя калектывы і спартыўныя каманды універсітэта прымалі ўдзел і паспяхова выступалі ў разнастайных конкурсах, фестывалях, спартыўных спаборніцтвах як рэспубліканскага, так і міжнароднага ўзроўню. Дастаткова толькі нагадаць назвы гэтых калектываў: ансамбль «Капрыс», СТЭМ, тэатр моды, фальклорны ансамбль «Алёна». Таксама славу універсітэту прыносяць каманды барцоў класічнага стылю, баскетбалістаў, валейбалістаў, гандбалістаў, лёгкаатлетаў.

Працягваўся пошук новых форм выхаваўчага ўздзеяння на студэнтаў. Важным здабыткам з'явіўся універсітэцкі конкурс факультэцкіх каманд клуба вясёлых і знаходлівых, які становіцца традыцыйным, удзел універсітэцкай каманды КВЗ у рэспубліканскіх спаборніцтвах і выхад яе ў першую рэспубліканскую лігу. Сфарміраваны універсітэцкі педагагічны атрад з 30 чалавек для работы з падлеткамі ў мікрараёнах Вішнявец і Дзевятоўка ў ліпені-жніўні. Несумненна, у бліжэйшым часе работа па патрыятычным выхаванні нашых студэнтаў папоўніцца новым і цікавым зместам, бо падпісаны дагавор аб творчым узаемадзеянні паміж універсітэтам і 28 гвардзейскім механізаваным корпусам Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь.

На жаль, у выхаваўчым працэсе пакуль цэлы шэраг недахопаў і праблем. Матэрыяльная база не дае магчымасці заўсёды якасна арганізоўваць і праводзіць выхаваўчую работу, асабліва агульнауніверсітэцкія мерапрыемствы, ахопліваць імі ўсіх студэнтаў і мець больш эфектыўныя вынікі. Усё яшчэ недастатковы ўплыў навучальнага працэсу на ўсебаковае выхаванне студэнтаў. Пэўная частка прафесарска-выкладчыцкага саставу займае пасіўную пазіцыю ў адносінах да мэтанакіраванай выхаваўчай работы. Нізкі ўзровень асабістай культуры ў значнай частцы студэнтаў стварае цяжкасці ў выхаваўчым працэсе.

Таму перад кафедрамі грамадскіх дысцыплін, аддзелам выхаваўчай работы пастаўлены задачы: распрацаваць да пачатку навучальнага года канцэпцыю выхаваўчага працэсу і праграму

*Працяг на 5-й стар.*

# САВЕТ УНІВЕРСІТЭТА: ГРАНІ ДЗЕЙНАСЦІ

*Пачатак на 3-й стар.*

выхаваўчай работы ва універсітэце, зыходзячы з прынцыпу дзяржаўнасці, патрыятызму, агульначалавечых і нацыянальных каштоўнасцей, магчымасцей універсітэта і рэгіёну. На падставе распрацаванай праграмы стварыць план выхаваўчай работы на 1998-1999 навучальны год, які павінен каардынаваць агульнауніверсітэцкія выхаваўчыя мерапрыемствы, планы выхаваўчай работы факультэтаў і студэнцкіх арганізацый.

## Навукова-даследчая работа

Асноўнай мэтай у галіне арганізацыі навукова-даследчай работы з'яўлялася выкарыстанне і развіццё навуковага патэнцыялу універсітэта для выканання фундаментальных і прыкладных даследаванняў у інтарэсах адукацыі, культуры і народнай гаспадаркі. Вырашаліся наступныя задачы: распрацоўка падыходаў да фармавання ва універсітэце цэласнай сістэмы арганізацыі навукі з арыентацыяй на канчатковыя вынікі; стварэнне ўмоў для павышэння эфектыўнасці работы па ўсіх напрамках навуковай дзейнасці, у прыватнасці ў галіне падрыхтоўкі кадраў вышэйшай кваліфікацыі, арганізацыі навуковай працы студэнтаў, і ў першую чаргу здольнай моладзі, выкананні фінансуемых навуковых даследаванняў; фармаванне асобных элементаў сістэмы работы з таленавітай моладдзю ва ўмовах шматузроўневай сістэмы адукацыі; павышэнне аб'ёмаў фінансуемых даследаванняў і ў прыватнасці гаспадарча-разліковых прац.

## Падрыхтоўка кадраў вышэйшай навуковай кваліфікацыі

Як доўгатэрміновую мэту на гэтым напрамку дзейнасці рэктарат ставіць задачу дабіцца колькасці супрацоўнікаў з вучонымі ступенямі і званнямі не ніжэй сярэдняга значэння па рэспубліцы.

Сёння прафесарска-выкладчыцкі састаў універсітэта налічвае 568 чалавек, у тым ліку 26 дактароў, 229 - кандыдатаў навук.

Структурныя падраздзяленні працавалі над павышэннем эфектыўнасці работы аспірантуры, стварэннем умоў выкладчыкам і супрацоўнікам для падрыхтоўкі дысертацый. Вынік - 4 доктарскія і 8 кандыдацкіх дысертацый. Доктарскія дысертацыі абаранілі У.А. Баркоў, Э.А. Галіцкі, Т.Я. Аўтуховіч, М.А. Маталыцкі. Кандыдацкія - А.І. Навойчык, А.В. Танкевіч, Ян Цзун Хуэй, А.А. Анісімава, Д.М. Лебядзевіч, С.Я. Чабуранава, В.І. Каяла, Т.А. Сіткевіч.

З мэтай актывізацыі падрыхтоўкі доктарскіх дысертацый уведзена ў дзеянне Палажэнне аб парадку і ўмовах прадастаўлення грантаў для завяршэння работы над доктарскімі дысертацыямі. Першыя дакументы прадстаўлены дацэнтам кафедры дыферэнцыяльных ураўненняў Г.Ч. Шушкевічам.

Разам з тым па плану павінна быць абаронена 10 доктарскіх і 37 кандыдацкіх дысертацый. Значнае разыходжанне паміж планам і фактам сведчыць аб тым, што і план нерэальны, і недастаткова зроблена для яго выканання. Эфектыўнасць работы аспірантуры застаецца нізкай. Патрабуе ўдасканалення сістэма набору і размеркавання аспірантаў, арганізацыя навучальнага працэсу ў магістратуры.

## Арганізацыя навуковых даследаванняў

У мінулым годзе даследаванні вяліся па 57 тэмах, аб'ём якіх складаў 3791,8 млн. рублёў, з іх 54 фінансаваліся са сродкаў дзяржбюджэту - 3774,8 млн. рублёў і з гаспадарчадагаворных НДР -7 млн. рублёў.

У выніку правядзення фінансуемых навуковых даследаванняў было апублікавана 512 работ.

У красавіку бягучага года ў Міністэрства адукацыі накіраваны праекты на конкурс фінансуемых навукова-даследчых работ са сродкаў дзяржбюджэта рэспублікі на 1998 год. Падрыхтавана 6 міжвузаўскіх праграм, у якіх універсітэт з'яўляецца ў якасці галоўнай арганізацыі. Можна адзначыць актывізацыю навукова-даследчай дзейнасці на юрыдычным факультэце. Упершыню гэты факультэт уключаны ў якасці выканаўцы ў выкананне дзяржаўнай праграмы фундаментальных даследаванняў «Дэмакратыя і культура», узначальваемай інстытутам філасофіі і права НАНБ (праф. Сільчанка М.У., Гушчын І.В.).

З чэрвеня 1997 года ва універсітэце было праведзена 17 навукова-практычных канферэнцый: 8 - міжнародных, 6 - рэспубліканскіх, 3 - абласных. Вызначыліся асобныя станоўчыя тэндэнцыі па збалансаваным развіцці грунтоўна-пошукавых, дзяржбюджэтных і гаспадарча-разліковых работ і выкарыстанні іх вынікаў.

## Павышэнне кваліфікацыі кадраў

Асноўнай мэтай у гэтым кірунку з'яўляецца павышэнне прафесійнага ўзроўню ПВС і супрацоўнікаў ва ўмовах развіцця рэспублікі. Для вырашэння гэтай задачы галоўным лічым стварэнне ўмоў для прафесарска-выкладчыцкага складу і супрацоўнікаў універсітэта ў павышэнні прафесійнага ўзроўню, мэтавую падтрымку асобных выкладчыкаў, зыходзячы з канкрэтных задач, якія стаяць перад кафедрамі і факультэтамі. Навуковым аддзелам распрацаваны перспектыўны план павышэння кваліфікацыі прафесарска-выкладчыцкага саставу на 1995-1999 гг., які кожны год карэкціруецца гадавымі планамі. На мэты павышэння кваліфікацыі было выдзелена 1130,9 млн. рублёў.

## Арганізацыя студэнцкіх навуковых даследаванняў

Асноўнай мэтай у галіне арганізацыі навукова-даследчай працы студэнтаў з'яўляецца павышэнне ўзроўню падрыхтоўкі спецыялістаў шляхам фарміравання ў іх уменняў і навыкаў даследчай працы, якія дазваляюць адаптаваць засвоеныя веды ў хутказменлівым акружаючым асяроддзі. Лічым неабходным стварэнне для найбольш таленавітых студэнтаў спрыяльных умоў для іх творчага развіцця.

Для гэтага распрацаваны комплексны план арганізацыі НДРС, створаны сістэма матэрыяльнага стымулявання студэнтаў, студэнцкае навуковае таварыства.

*Заканчэнне на 6-й стар.*

# САВЕТ УНІВЕРСІТЭТА: ГРАНІ ДЗЕЙНАСЦІ

*Пачатак на 3-й стар.*

У 1997 годзе з ліку студэнтаў, якія навучаюцца на дзённай форме, - 5258 - да навукова-даследчай работы было прыцягнута 1838. На навукова-тэхнічных канферэнцыях рознага ўзроўню студэнтамі прачытана 550 дакладаў, у тым ліку на міжнародных, рэспубліканскіх і на канферэнцыях, якія праходзілі ў іншых установах, - 89.

Самастойна і ў сааўтарстве студэнтамі апублікавана таксама 208 артыкулаў і тэзісаў дакладаў, выдадзены зборнік навуковых работ студэнтаў «Свежий ветер - 97», у які ўвайшлі навуковыя студэнцкія работы 1997 года па выніках унутрыуніверсітэцкага конкурса на лепшую студэнцкую НДР - 46 работ 52 аўтараў. Рыхтуецца да выдання зборнік навуковых дакладаў «Свежий ветер - 98».

За паспяховую навукова-даследчую работу ў справаздачным годзе грашовыя прэміі атрымалі 103, ганаровыя граматы - 142 студэнты.

## Адміністрацыйна-гаспадарчая работа

У 1997 фінансавым годзе даходная частка бюджэта універсітэта фармавалася такім чынам. Бюджэтнае фінансаванне склала 63 працэнты, пазабюджэтныя паступленні - каля 37 працэнтаў. Найбольш істотнымі крыніцамі пазабюджэтных паступленняў былі платныя формы 1-2 вышэйшай адукацыі - больш за 27 працэнтаў, працэнт па дэпазіту, АДП і інш.

Расходная частка бюджэту прадстаўлена артыкуламі на аплату працы і стыпендыі, налічэнні на заработную плату і падаткі, матэрыялы, канцылярскія прылады, бягучы і капітальны рамонт, абсталяванне, эксплуатацыю памяшканняў, плату за камунальныя паслугі і г.д.

У бягучым навучальным годзе грунтоўна адрамантавана падлога трох паверхаў галоўнага корпуса, санітарных вузлоў, зроблены рамонт асфальтавага пакрыцця, пабудавана новае памяшканне на другім паверсе, а таксама выкананы вялікі аб'ём па бягучым рамонце памяшкання. На факультэце фізічнай культуры грунтоўна адрамантаваны дзве спартыўныя залы, праводзіцца рэканструкцыя гардэробаў, вядзецца рамонт асфальтавага пакрыцця вакол корпуса. У корпусе па БЛК пабудавана аўдыторыя на 80 чалавек, адрамантавана сістэма вентыляцыі ўсіх збудаванняў, заменена больш за 400 асвятляльных прыбораў.

Пастаянна вядзецца работа па паляпшэнні ўмоў пражывання студэнтаў і выкладчыкаў у інтэрнатах.

Усяго ў мінулым навучальным годзе на бягучы і капітальны рамонт было патрачана больш як пяць з паловай мільярды рублёў бюджэтных і пазабюджэтных сродкаў.

## Знешнія сувязі універсітэта

Ва ўмовах абмежаваных фінансавых рэсурсаў сувязі з горадам і вобласцю, мясцовымі органамі ўлады, з прамысловымі прадпрыемствамі жыццёва неабходны для кожнага універсітэта. Такім сувязям універсітэт павінен надаваць нават большае значэнне, чым замежным сувязям. Хаця менавіта нашы замежныя сувязі ў значнай меры дапамагаюць нам падтрымліваць добрыя сяброўскія і дзелавыя кантакты з вну, мясцовымі органамі ўлады, прадпрыемствамі і недзяржаўнымі арганізацыямі.

Універсітэт прымаў удзел у міжнародных праектах і праграмах INCO-COPERNICUS, TEMPUS, TACIS. Супрацоўнічалі таксама з аблвыканкамам па падрыхтоўцы тэндарных матэрыялаў, удзельнічалі ў перамовах па праекту «Рэгіянальнае развіццё і ахова прыроды ў Еўрарэгіёне «Нёман» па праграме TACIS. Супрацоўнікі універсітэта прынялі ўдзел у распрацоўцы інфармацыйнага кампакт-дыска аб Гродзенскім рэгіёне. Сумесна з рэгіянальнымі органамі ўлады былі праведзены семінары Сусветнага банка, федэральнай адміністрацыі ФРГ і абласны семінар па інфармацыйна-тэхнічным забеспячэнні знешнеэканамічнай дзейнасці.

Нягледзячы на знешнія ўмовы, замежныя сувязі універсітэта заставаліся дынамічнымі. На працягу мінулага навучальнага года ў Швейцарыю, Польшчу, Германію, ЗША, Расію, Вялікабрытанію, Украіну, Румынію былі камандзіраваны 182 чалавекі, у тым ліку 133 выкладчыкі і аспіранты і 49 студэнтаў. А універсітэтам прыняты 140 чалавек з краін блізкага і далёкага замежжа.

## Быт, адпачынак

Закладзена прававая база па рэалізацыі сацыяльнай абароны супрацоўнікаў універсітэта. Гэта - палажэнні, праграмы, якія датычаць розных бакоў жыцця, працы і адпачынку.

Па-ранейшаму балючай тэмай лічым забеспячэнне жыллём. Праграма «Жыллё» распрацавана і прынята ў лістападзе мінулага года. У гэтым жа годзе адбыліся доўгачаканыя змены. Універсітэт атрымаў 18 дзяржаўных кватэр у доме N 62 па вуліцы Горкага, а таксама набылі 3 кватэры для выкладчыкаў, заключылі дагавор з аблвыканкамам на куплю яшчэ 2 кватэр. Плануем да канца года атрымаць яшчэ 3-4 кватэры ў ЖБК і КІЗе. Вырашэнне праблемы пражывання студэнтаў звязваем з будаўніцтвам інтэрната ў мікрараёне «Дзевятоўка».

Нядрэнна наладжана аздараўленне супрацоўнікаў і іх дзяцей. У мінулым годзе адміністрацыя выдзеліла прафкаму на санаторна-курортнае лячэнне 175 мільёнаў рублёў. Гэта дазволіла дадаткова набыць 48 санаторных пуцёвак для дарослых і 63 - для дзяцей. А ўсяго ў 1997 годзе 62 супрацоўнікі і 85 дзяцей змаглі палепшыць сваё здароўе ў санаторыях і дзіцячых аздараўленчых лагерах. Сёлета на аздараўленне выдзелена такая ж сума. Тым не менш праблема аздараўлення ёсць. Належыць вывучыць пытанне больш эфектыўнага выкарыстання прафілакторыяў ведамаснага тыпу, якія знаходзяцца недалёка ад Гродна. Існуе магчымасць узяць на баланс універсітэта аздараўленчую базу медыцынскага інстытута ў Азёрах, якая ў апошнія гады не выкарыстоўваецца.

Неабходна прызнаць, што ўзровень аплаты працы застаецца нізкім. У цэлым па універсітэту сярэдняя заработная плата прафесарска-выкладчыцкага саставу складала прыблізна 87,9 працэнта да аналагічнага ўзроўню служачых у прамысловасці. Праблемы мы добра бачым, і разам з камісіяй прафкама па заработнай плаце шукаем шляхі па ўдасканаленні крыніц матэрыяльнага стымулявання супрацоўнікаў універсітэта. Неабходна ў бліжэйшы час завяршыць распрацоўку Палажэння аб матэрыяльным стымуляванні.

Сітуацыя з грамадскім харчаваннем таксама патрабуе змен. Гарадскі трэст сталовых і рэстаранаў не можа выконваць свае абавязкі па забеспячэнні харчавання студэнтаў у межах прадугледжаных урадам правілаў арэнды. Таму ўносіцца прапанова стварыць ва універсітэце сваю службу - камбінат грамадскага харчавання.

# ДЛЯ ВАС, ПЕРВОКУРСНИКИ

Традиционно студенты, поступившие в Гродненский государственный университет имени Янки Купалы, становятся членами профсоюза работников образования и науки.

Профсоюзный комитет студентов университета, избираемый на основании Устава профессионального союза работников образования и науки Беларуси, осуществляет представительство перед администрацией высшего учебного заведения от имени студентов по всем вопросам обучения, труда, быта, образования, щего голоса и выступают в них от имени профсоюзной организации; участвует в разработке и принятии Устава вуза; контролирует правильность и своевременность назначения и выплаты стипендий, командировочных расходов и различных пособий; участвует через своих представителей в работе студенческих советов общежитий; принимает участие в осуществлении мероприятий по улучшению условий труда, быта и отдыха студентов, проводит воспитательную работу; участвует в органи-



отдыха и пользуется правами юридического лица. Целью деятельности профкома студентов является защита социально-экономических и иных интересов студентов.

Профком студентов заключил с администрацией вуза Соглашение по всем аспектам жизни и деятельности студентов в университете.

Что же значит и что делает профком?

Студенческий профком организует общественный контроль за выполнением нормативных документов, касающихся обучения студентов, их социально-экономических и иных прав; вносит руководству высшего учебного заведения предложения по улучшению организации учебного процесса, производственной практики, рациональному использованию бюджета времени студентов, по составлению расписания экзаменов, зачетов, консультаций. Представители студенческого профкома пользуются в советах и в комиссиях правом решаю-

зации и проверке выполнения планов строительства, ремонта и оборудования студенческих общежитий, культурно-бытовых учреждений и спортивных сооружений, в контроле за правильным расходованием средств, ассигнованных на эти цели. Представитель студенческого комитета участвует на правах члена в комиссиях по приемке в эксплуатацию студенческих общежитий, культурно-бытовых учреждений и спортивных сооружений; организует контроль за работой предприятий общественного питания, обслуживающих студентов; часы работы столовых, буфетов устанавливаются с участием студенческого профкома; оказывает помощь малообеспеченным студентам, студентам-сиротам, инвалидам, студенческим семьям; направляет студентов на санаторно-курортное лечение, в дома отдыха, профилактории и в оздоровительно-спортивные лагеря; участвует в осуществлении практических мероприятий по совершенство-

ванию лечебно-оздоровительной работы; осуществляет общественный контроль за соблюдением законодательства и правил охраны труда и учебы; вносит предложения в местные органы власти и управления, администрации вуза, в вышестоящие профсоюзные органы, направленные на решение учебных, социально-экономических и других проблем студентов; совместно со студенческим и спортивным клубами проводит работу по организации досуга студентов; взаимодействует в своей работе с различными общественными формированиями учащейся молодежи.

Совместно администрация и профком студентов проводят распределение мест в общежитии между факультетами, отделениями и курсами; принимают решение о выделении жилой площади в общежитии и продолжительности сроков проживания.

Администрация высшего учебного заведения назначает заведующих общежитиями, воспитателей, культорганизаторов и инструкторов по физкультуре с учетом мнения профкома студентов.

Таким образом профком - ваш надежный советчик, защитник и друг. Приведем еще несколько примеров из университетской жизни.

В 1997-1998 учебном году дополнительно 3 человека получали профсоюзные стипендии.

Профкомом только из своих средств выплачено материальной помощи в размере 70 млн. рублей. Израсходовано на проведение спортивных мероприятий около 18 млн. рублей. Проведено большое количество культурно-массовых мероприятий (конкурс первокурсников, КВН, концерт Государственного оркестра под управлением М.Финберга, автобусные экскурсии в другие города и т.д.), на которые израсходовано порядка 125 млн. рублей.

По льготной цене распространялись абонементы в ФОК и облдрамтеатр, а также билеты на многие городские концерты. Подготовлен новогодний утренник для детей студентов, закуплены подарки для них.

При непосредственном участии студенческого профкома создана сборная команда КВН «Янки», которая участвовала в двух республиканских фестивалях команд КВН, в результате чего вышла в первую лигу белорусского КВН. Подготовлена научная студенческая конференция «Наука-98». Специально для студентов проведена встреча с ректором и руководством университета по вопросам жизнедеятельности университета.

Активно сотрудничаем со многими студенческими организациями в Беларуси, Москве, на Украине.

Только в профкоме можно приобрести международный студенческий билет ISIC, дающий скидку на многие виды услуг более чем в 95 странах мира.

Это основные направления деятельности профкома студентов. У студентов бюджетной формы обучения безналичным путем через бухгалтерию университета ежемесячно удерживаются профвзносы в сумме 1% от стипендии. Студенты, занимающиеся на договорной основе, ежемесячно платят взносы в сумме одного процента от минимальной заработной платы.

Профсоюзный комитет поможет Вам реализоваться за время студенческой жизни и избавит от лишних проблем в университете.

По всем вопросам и с любыми предложениями обращайтесь с 9.00 до 18.00 по рабочим дням в профком студентов: кабинет N 229 главного корпуса. Тел: 44-50-54.

**Председатель: Александр Александрович ГРИНЬ.**
**Зам. председателя: Игорь Леонидович КЕРГЕТ.**
**Профком студентов.**

# ЗАПРАШАЕМ ДА СУПРАЦОЎНІЦТВА

**Да 60-гадовага юбілею універсітэта рыхтуецца бібліяграфічны слоўнік «Выкладчыкі Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Янкі Купалы» пад рэдакцыяй загадчыка кафедры гісторыі славянскіх дзяржаў прафесара В.М. Чарапіцы, які распрацаваў узоры напісання дакументаў для выдання слоўніка. Спадзяемся, што Вы, паважаныя чытачы, зацікавіцеся і прымеце актыўны ўдзел у падрыхтоўцы бібліяграфічнага слоўніка. Допісы просьба накіроўваць прафесару В.М. Чарапіцы.**

Дэкану факультэта, заг. кафедры, кіраўніку аддзела (неабходнае падкрэсліць)

### ІНФАРМАЦЫЙНЫ ЛІСТ

Згодна з загадам рэктара №___ ад ________ "Аб выданні матэрыялаў, прысвечаных 60-годдзю ГрДУ ім. Я. Купалы" ва універсітэце ствараецца кароткі бібліяграфічны слоўнік "Прафесары і выкладчыкі Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Янкі Купалы (1940-2000 г.)". Кіраўніком аўтарскага калектыву зацверджаны загадчык кафедры гісторыі славянскіх дзяржаў прафесар В.М. Чарапіца.

Вышэйпаказаны загад абавязвае дэканаў факультэтаў, загадчыкаў кафедр, кіраўнікоў аддзелаў аказваць неабходную дапамогу творчаму калектыву ў напісанні запланаванай працы.

На цяперашні момант аўтарскім калектывам слоўніка распрацаваны прынцыпы і структура выдання, асноўныя падыходы да зместу яго артыкулаў (гл. схему і ўзор), да інфармацыйнага ліста.

Навукова-метадычным семінарам з ліку ўдзельнікаў аўтарскіх калектываў па падрыхтоўцы юбілейных выданняў прапанавана: папершае, змяшчаць артыкулы ў слоўніку аб усіх прафесарах і выкладчыках, якія працуюць на сённяшні дзень ва універсітэце, а таксама аб тых, якіх тут працавалі ў папярэднія гады на працягу не менш года;

па-другое, артыкулы згодна са схемай і ўзорам пішуцца кожным з выкладчыкаў асабіста, уключаючы і тых з іх, хто знаходзіцца на пенсіі;

па-трэцяе, у тых выпадках, калі выкладчык ва універсітэце ўжо не працуе па розных прычынах, ці ў сувязі са смерцю, то такі артыкул аб ім пішацца па даручэнні загадчыка кафедры тым ці іншым выкладчыкам;

па-чацвёртае, аддзел кадраў, архіў універсітэта, бібліятэка абавязаны падаць па патрабаванні аўтараў артыкулаў усю неабходную для іх напісання інфармацыю, якая датычыцца аўтабіяграфіі, працоўнай дзейнасці асноўных навуковых работ па тэме артыкула (гл. узор заяўкі);

па-пятае, у частцы артыкула, прысвечанай навуковым працам выкладчыка, спіс іх павінен быць абмежаваны найбольш буйнымі даследаваннямі колькасцю не больш дзесяці.

Артыкул павінен быць напісаны згодна з прапануемай схемай і ўзорам, надрукаваны на машынцы ў 3-х экз. праз 1,5 інтэрвалы на адным баку ліста. Другі экзэмпляр артыкула павінен быць завізаваны ў ніжняй частцы яго аўтарам і загадчыкам кафедры.

Падрыхтаваныя на кафедры артыкулы на ўсіх выкладчыкаў павінны быць перададзены яе загадчыкам у дэканат гістарычнага факультэта (завулак Даватара, 3/1, вуч. корп. ГрДУ, II паверх, каб. 204).

Карэктывы ў тэксты біяграфічных артыкулаў, складзеныя ў мінулыя гады, павінны быць абавязкова зроблены выкладчыкамі ці заг. кафедр на працягу месяца пасля выдання дадзенай інфармацыі. Па пытаннях дапрацоўкі такіх артыкулаў можна звяртацца на кафедру гісторыі славянскіх дзяржаў штодзённа, акрамя суботы і нядзелі з 10 да 12 гадзін па вышэй названаму адрасу. Даведкі па тэл. 33-32-45 даюць прафесар В.М. Чарапіца, дацэнты Н.Л. Улейчык, М.Я. Калацэй.

Уся адказнасць за якасную і тэрміновую падрыхтоўку тэкстаў артыкула ўскладаецца на дэканаў факультэтаў, заг. кафедр і кіраўнікоў аддзелаў.

### СХЕМА
**напісання артыкула да бібліяграфічнага слоўніка «Выкладчыкі Гродзенскага дзяржуніверсітэта імя Я. Купалы».**

*I. Біяграфічны раздзел*

1. Прозвішча, імя, імя па бацьку (калі ёсць, псеўданім).
2. Месца працы: выкладчык, дацэнт і г.д. кафедры.
3. Дакладная дата і месца нараджэння. Для асоб, якія нарадзіліся ў межах Расійскай імперыі да 1 (14) лютага 1918 г., даты жыцця ўказваюцца паводле старога і новага стылю (новы стыль у дужках). Месца нараджэння ў дакастрычніцкі перыяд указваецца як паводле ранейшага, так і паводле сучаснага адміністрацыйнага падзелу (з улікам змен геаграфічных назваў).
4. Кароткая аўтабіяграфія з указаннем канкрэтных датаў (у дужках): заканчэнне школы, ВНУ (яго назва, факультэт, аддзяленне), месца працы (згодна з працоўнай кніжкай), служба ў арміі, вучоба ў аспірантуры, дактарантуры, абарона дысертацыі (тэма, год, месца абароны).
5. Навуковая, літаратурная, спартыўная, рацыяналізатарская і інш. дзейнасць. Зазначыць асноўную тэматыку публікацый, дасягненні, вынікі.
6. Удзел у грамадскім жыцці. Сяброўства ў навуковых, літаратурных, спартыўных, грамадскіх і інш. таварыствах.

*II. Бібліяграфічны раздзел*

Паказаць згодна з храналагічнай паслядоўнасцю і правіламі бібліяграфічнага апісання наступнае:

1. Манаграфіі, кнігі, літаратурныя творы.
2. Аўтарэфераты дысертацый, падручнікі, метадычныя дапаможнікі, брашуры і інш.
3. Публікацыі ў калектыўных зборніках і перыядычных выданнях (найбольш значныя).
4. Пераклады твораў, зробленыя аўтарам.

Колькасць абмяжоўваецца да 10, але калі гэта публікацыі пад № 1-2, то неабмежавана. Апісанне даецца на мове арыгінала.

*III. Прыкладваецца фотаздымак (любога памеру) у 1 экз.*

### УЗОР АРТЫКУЛА

Якімовіч Іван Іванавіч (псеўд. Янка). Дацэнт кафедры гісторыі Беларусі. Нарадзіўся 30.04.1956, г. Слонім Гродзенскай вобласці. У 1973 г. скончыў сярэднюю школу N 1 і паступіў на гістарычны факультэт Гродзенскага універсітэта (скончыў у 1978). У 1978-1980 праходзіў вайсковую службу. Вучыўся ў аспірантуры на гістарычным факультэце БДУ. Тэма кандыдацкай дысертацыі «Правядзенне рэформы 1861 г. у Гродзенскай губерні» (абаронена ў БДУ у 1985 г.). Працаваў старшым навуковым супрацоўнікам у Гродзенскім гісторыка-археалагічным музеі (1985-1987). З 1987 - у Гродзенскім дзяржаўным універсітэце, ст. выкладчык, дацэнт. З 1993 знаходзіцца ў дактарантуры пры інстытуце гісторыі АН РБ. Асноўная тэматыка навуковых публікацый: гісторыя Гродзеншчыны, сацыяльна-эканамічнае развіццё Беларусі ў II палове XIX ст. Сябар таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры, член прэзідыума Гродзенскага абласнога фонду культуры і абласной краязнаўчай асацыяцыі.

### БІБЛІЯГРАФІЯ

1. Проведение реформы 1861 г. в Гродненской губернии. Автореферат на соискание ученой степени канд. ист. наук. - Минск, 1985.
2. Постаці. Зборнік гістарычных нарысаў. - Гродна, 1987.
3. Іншаземныя аўтары пра Беларусь XIX ст. // - 1990 - № 12. - С. 22-23.
4. История России. Методические разработки для слушателей ОДП и п/о. Ч.2. С начала XIX в. до 1917 г. - Гродно, 1992. - С. 3-53, 63-69 (в соавторстве).
5. Мастак з Навагрудчыны // Навагрудскія чытанні. Ч. 1. - Навагрудак, 1995. - С. 20-23.
6. «Каб быць вольнымі...» // Гарадзенскія запісы (старонкі гісторыі і культуры). Вып. 1. - Гародня, 1998. - С. 75-79.

### УЗОР

Загадчыку аддзела кадраў, архіва універсітэта, навуковай бібліятэкі (неабходнае падкрэсліць)

Дэканат (кафедра) ____________ (назва)

хадайнічае аб аказанні дапамогі ў напісанні артыкула ____________ (назва)

да бібліяграфічнага слоўніка «Прафесары і выкладчыкі Гродзенскага дзяржуніверсітэта імя Я. Купалы».

Дэкан (заг. кафедры)

____________ (дата)

*Рэдактар* Людміла Мікалаеўна ДАНІЛАВА

*Заснавальнік:* *Гродзенскі дзяржаўны універсітэт імя Янкі Купалы.*

Рэгістрацыйнае пасведчанне № 519.

Газета набрана, звярстана і надрукавана на тэхніцы выдавецкага аддзела Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Янкі Купалы. ЛП № 111 ад 29.12.97 г. Вул. Ажэшкі, 22, 230023, г. Гродна.

*Набор і вёрстка:* М. ВЕРСТАК, П. БАЗЫЛЬЧЫК

*Карэктура:* Н. ДУДКО

*Здадзена ў набор 17.08.98. Падпісана да друку: 28.08.98. 15.00 Заказ № 100*

Аб'ём - 1 ум. друк. арк. Наклад 500 асобнікаў.

Аўтары надрукаваных матэрыялаў адказваюць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытатаў, эканамічных даных, асабістых імёнаў, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытай публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не падзяляючы пункту гледжання аўтара.

*Наш адрас:* ✉ *230023, г.Гродна, вул. Ажэшкі, 22, пакой 228.* ☎ *72-08-17.*